БІБЛІЯТЭЧНЫЯ ФОНДЫ

Бібліятэчны фонд ДУК "Карэліцкая раённая бібліятэка" на 01.01.2026 г. налічвае 249114 экз. дакументаў, у тым ліку:

- кнігі, брашуры – 221887 экз. (89 %)
- аўдыёвідэаматэрыялы – 392 экз. (0,16 %)
- выяўленчыя дакументы — 517 экз. (0,21%)
- электронныя дакументы – 1138 экз. (0, 46 %)
- іншыя матэрыялы (ноты, карты) – 4 682 экз. (1,88 %)
- перыядычныя выданні – 20498 экз. (8,2 %)
- мастацкая літаратура – 143645 экз. (57,66 %)
- на беларускай мове –85259 экз. ( 34,22 %)
- дзіцячая літаратура – 32650 экз. (13,10 %)

Новыя паступленні склалі: 5379 экз., з іх кніг 2928 экз., перыядычных выданняў – 2450 экз., іншыя віды –1 экз.

На папаўненне фондаў бібліятэк з мясцовага бюджэту ў 2025 годзе выдзелена 73200 руб., гэта 12,15 % ад агульнай сумы бюджэтнага фінансавання. За кошт мясцовага бюджэту набыта 4931 экз. на суму 79280,84 — гэта 14,05 %

- у тым ліку атрымана напрамую з дзяржаўных выдавецтваў (УП "Мастацкая літаратура", РЦПІ, ВД "Звязда", ОДО "Четыре четверти", Выдавецтва" Беларусь", РУП ВД "Беларуская навука", РУП "Адукацыя і выхаванне", РУП "Редакция журнала «Дело (Восток+Запад»", ТАА "Харвест", ТАА "Книжный сад") 2481 экз. дакументаў на суму 42387,16 руб .
- сацыяльна значнай літаратуры набыта 1134 экз. на суму 20708,04 руб.

Для папаўнення кніжных фондаў бібліятэк выкарыстоўваліся дадатковыя крыніцы камплектавання. У выніку акцыі "Насустрач адзін аднаму" бібліятэкі атрымалі кнігі ў дар ад чытачоў. Так, са сваіх асабістых бібліятэк падарылі чытачы кнігі ў Карэліцкую раённую бібліятэку, Турэцкую и Лукскую бібліятэкі, Мірскую гарпасялковую бібліятэку. Імі падорана 324 экз. на суму 3320,13 руб.

ААТ "Белкніга" аказала дапамогу ў папаўненні фондаў бібліятэк у колькасці 44 экз. дакументаў, на суму 2795,62 руб.

З абменнага фонду абласной бібліятэкі паступіла 16 экз. на суму 104,40 руб.

Усяго за 2025г. па ДУК "Карэліцкая раённая бібліятэка" падпіска на перыядычныя выданні складала 91 назва, з іх часопісаў - 55, газет - 36.

- на раённую бібліятэку: усяго 74 назвы (з іх газет - 29, часопісаў- 45);
- на гарпасялковую бібліятэку: усяго 31 назва (з іх газет -11, часопісаў - 20;

- на 1 сельскую бібліятэку: усяго 14 назваў (з іх газет- 7 , часопісаў- 7);
- на 1 бібліятэку аграгарадка: усяго 14 назваў (з іх газет- 7, часопісаў-7);

За справаздачны год у ДУК “Карэліцкая раённая бібліятэка” паступіла 2928 экз. кніг, у тым ліку:

- на раённую бібліятэку – 613 экз.
- на гарпасялковую бібліятэку - 425 экз.
- на 1 сельскую бібліятэку – 172 экз.
- на 1 бібліятэку аграгарадка – 172 экз.
- на 1 чытача – 37 экз.

Працэнт абнаўлення фонду – 2,2 %.